Гукаем вясну разам
01.03.2022 15:59

Пасля доўгай зімы мы вельмі чакаем цёплай, сонечнай вясны. Нашы продкі, каб развітацца з зімой і паскорыць надыход вясны, праводзілі прыгожы і радасны абрад “Гуканне вясны”. Дзяўчаты ў гэтыя дні на ўзвышшах спявалі песні-вяснянкі, у якіх вясна ўяўлялася маладой і прыгожай дзяўчынай. У песнях прасілі сонца хутчэй прагрэць зямлю. Моладзь вадзіла карагоды, наваколле ўпрыгожвалася яркімі стужкамі і рознакаляровымі папяровымі птушкамі. 1 сакавіка, у першы дзень вясны, вучні 5Б класа наведалі сваіх малодшых сяброў з 1 Б класа і расказалі пра гэта яркае і самабытнае свята, дарылі дзецям птушачак, спявалі вяснянкі.